# ДАДАТАК 1

## Геаграфічныя тыпы сельскай гаспадаркі свету

| Катэгорыя сельскай гаспадаркі | | Геаграфічны тып | |
|---|---|---|---|
| 1 | Нетаварная (спажывецкая) традыцыйная сельская гаспадарка | 1 | Земляробства ў спалучэнні са збіральніцтвам (клубняплоды, збожжавыя, бабовыя, алейныя), паляваннем і рыбалоўствам |
| | | | **Геаграфія:** *зона трапічных лясоў Афрыкі, Паўднёвай Амерыкі і Азіі* |
| | | 2 | Качавая пашава-жывёлагадоўчая гаспадарка з рознымі відамі жывёлы (вярблюды, авечкі, коні, алені) |
| | | | **Геаграфія:** *засушлівыя вобласці трапічнай і ўмеранай зоны Афрыкі і Азіі. Зона тундры Азіі і Паўночнай Еўропы* |
| 2 | Таварная і паўтаварная традыцыйная сялянская і панска-латыфундысцкая гаспадарка | 3 | Земляробчая гаспадарка — працаінтэнсіўнае рысаводства |
| | | | **Геаграфія:** *Азія* |
| | | 4 | Земляробчая і земляробча-жывёлагадоўчая гаспадарка. Асноўныя культуры — харчовыя збожжавыя (рыс, кукуруза, прасяныя). Галоўныя таварныя культуры — бананы, кава, чай, какава-бабы, сізаль, каўчуканосы. Экстэнсіўная жывёлагадоўля (прадукцыйная і цяглавая жывёла) не звязаная з раслінаводствам |
| | | | **Геаграфія:** *Афрыка, Азія і Лацінская Амерыка* |
| | | 5 | Шматгаліновая земляробча-жывёлагадоўчая гаспадарка. Разнастайнасць таварных і спажывецкіх культур, якія вырошчваюцца, а таксама відаў жывёлы. Жывёлагадоўля цесна звязаная з земляробствам.<br>Кукуруза, рыс, прасяныя, пладовыя, стымулюючыя і тэхнічныя культуры (бананы, кава, какава-бабы, чай, каўчуканосы, валакністыя расліны) |
| | | | **Геаграфія:** *Азія і Лацінская Амерыка, часткова Паўднёвая і Заходняя Еўропа* |

| Катэгорыя сельскай гаспадаркі | | Геаграфічны тып | |
|---|---|---|---|
| 3 | Таварная спецыялізаваная сельская гаспадарка (фермерская, дзяржаўна-кааператыўная, сялянская, карпаратыўная) | 6 | Экстэнсіўная збожжавая гаспадарка (пшаніца, кукуруза) |
| | | | **Геаграфія:** *Паўночная Амерыка, Аўстралія, Расія* |
| | | 7 | Экстэнсіўная пашавая жывёлагадоўля |
| | | | **Геаграфія:** *Паўночная Амерыка, Аўстралія, ПАР, Аргенціна, Уругвай, Расія, Казахстан* |
| | | 8 | Інтэнсіўнае земляробства (збожжавыя, тэхнічныя, пладовыя, агароднінныя культуры) |
| | | | **Геаграфія:** *Заходняя Еўропа, Паўночная Амерыка, Японія, Кітай* |
| | | 9 | Інтэнсіўная жывёлагадоўля (малочная і малочна-мясная жывёлагадоўля, свінагадоўля, птушкагадоўля) |
| | | | **Геаграфія:** *Заходняя Еўропа (Вялікабрытанія, Германія), ЗША, Новая Зеландыя, Украіна, Расія* |
| | | 10 | Інтэнсіўная земляробча-жывёлагадоўчая гаспадарка (агародніцтва, пладаводства, малочна-мясная жывёлагадоўля, свінагадоўля, птушкагадоўля), часта прыгараднага тыпу |
| | | | **Геаграфія:** *Паўночная Амерыка, Заходняя Еўропа* |
| | | 11 | Плантацыйная раслінаводчая гаспадарка (пладовыя, стымулюючыя, тэхнічныя культуры) у трапічных і субтрапічных абласцях |
| | | | **Геаграфія:** *Азія, Афрыка, Лацінская Амерыка* |